роде на самом деле. Все семь пространств галерей музея доступны для просмотра в формате 360 градусов. Одним движением сенсорного экрана или щелчком мыши посетители попадают в одно из самых священных мест Европы. Например, можно войти в Сикстинскую капеллу и затем изменить угол экскурсии, чтобы осмотреть знаменитую потолочную роспись Леонарда да Винчи. Тур также позволяет посетителям прогуляться по Ватикану и его окрестностям, включая базилику Святого Петра и площадь, а также многие другие достопримечательности. Одна из лучших особенностей виртуального тура заключается в том, что величие архитектуры действительно оживает. Кликая на всплывающие окошки, можно ознакомиться с историей представленных экспонатов или прочитать их названия, авторов и год создания.

Таким образом, эпидемиологическая обстановка 2020–2021 гг. способствовала формированию новых подходов к организации эстетического воспитания в вузе, расширяя возможности его планирования и реализации.

*M. Y. SHIRYAEVA, O. V. ZOLOTOVA, G. I. SAYANOVA*
*Belarusian State Medical University, Minsk*

**IMPLEMENTATION OF AESTHETIC EDUCATION IN MODERN CONDI-TIONS**

The article discusses the issues of organizing aesthetic educational events in modern epidemiological conditions using the latest Internet technologies. Links and examples that can be used in the preparation of extracurricular curatorial hours are given.

Получено 01.02.2021

УДК 821.161.09(092)

# СЯМЕЙНАЕ ВЫХАВАННЕ НА АСНОВЕ ТРАДЫЦЫЙНАЙ АКСІЯЛАГІЧНАЙ МАДЭЛІ КЛАСІЧНАЙ БЕЛАРУСКАЙ ЛІТАРАТУРЫ

*А. У. ЯРМОЛЕНКА*
*Беларускі дзяржаўны ўніверсітэт транспарту", г. Гомель*

У артыкуле аналізуецца роля сістэмы традыцыйных сямейных каштоўнасцей класічнай беларускай літаратуры для выхавання асобы. Асэнсаваны традыцыйныя формы і функцыі сям'і, роля і месца яе членаў у сямейнай іерархіі, асноўныя задачы і спосабы выхавання. Вызначаны дамінуючы ўплыў на фарміраванне і развіццё падрастаючага пакалення аксіялагічнай мадэлі традыцыйнай беларускай сям'і.

Сямейныя каштоўнасці займаюць дамінуючае становішча ў аксіялагічнай іерархіі ў беларускім грамадстве на працягу стагоддзяў. З цягам часу сістэма традыцыйных сямейных каштоўнасцей трансфармуецца і відазмяняецца, але аснова, закладзеная народнымі абрадамі і звычаямі,

шматвекавымі рытуаламі сямейнага ўкладу, застаецца нязменнай. У XXI стагоддзі важнасць асэнсавання, захавання і перадачы традыцыйных сямейных каштоўнасцей для падтрымкі жыццядзейнасці грамадства выступае на першы план па цэлыму шэрагу прычын. Па-першае, каштоўнасці фарміруюць у сям'і погляд на жыццё, спосаб ацэнкі свету і асабістага становішча чалавека ў соцыўме, а таксама нацыянальную ідэнтычнасць і менталітэт. Па-другое, традыцыйны сямейны лад уплывае на меркаванні, паводзіны і стыль выхавання, служаць асновай для абароны, кіраўніцтва, узаемаразумення і падтрымкі ў сям'і. Па-трэцяе, прывіццё сямейных каштоўнасцяў выступае асноўным фактарам развіцця і ўдасканалення будучага пакалення, усведамлення аксіялагічнай структуры чалавечай цывілізацыі.

Творы класікаў беларускай літаратуры служаць прыкладам захавання і перадачы нашчадкам традыцыйных сямейных каштоўнасцей. Мадэль традыцыйнай беларускай сям'і адлюстравана ў паэме Якуба Коласа "Новая зямля", паэме Янкі Купалы "Яна і я", аповесці Максіма Гарэцкага "Камароўская хроніка". Маштабныя творы пісьменнікаў з'яўляюцца своеасаблівай энцыклапедыяй традыцыйнага сямейнага ўкладу, якая адлюстроўвае, як на працягу стагоддзяў на тэрыторыі Беларусі на аснове міфалагічных і фальклоных абрадаў і звычаяў фарміравалася мадэль сямейных адносін, аксіялагічная канцэпцыя традыцыйнай беларускай сям'і.

У паэмах "Новая зямля", "Яна і я", аповесці "Камароўская хроніка" паказана традыцыйная сям'я беларусаў у XIX – пачатку XX стагоддзяў, якая прадстаўлена дзвюма асноўнымі відамі: вялікая і малая сем'і (у залежнасці ад колькасці шлюбных пар і ступені сваяцкіх адносін) і двума асноўнымі тыпамі: бацькоўская і брацкая сем'і (у залежнасці ад асобы, якая кіравала сям'ёй). У творах класікаў беларускай літаратуры асэнсаваны важныя функцыі традыцыйнай сям'і: рэпрадуктыўная, эмацыянальная, выхаваўчая, сацыяльная, эканамічная.

Янка Купала, Якуб Колас і Максім Гарэцкі падрабязна апісваюць колькасны і якасны састаў сялянскай сям'і; дэталі жыцця кожнага з членаў сям'і; сацыяльныя, палітычныя і эканамічныя абставіны існавання малай сацыяльнай групы; функцыі старэйшых і малодшых членаў сям'і. Аўтары акцэнтуюць асаблівую ўвагу на абрадах і звычаях, якія перадаюцца з пакалення ў пакаленне, дапамагаюць захаваць пераемнасць традыцый, строга рэгламентуюць паводзіны родных і блізкіх, бацькоў і дзяцей у святочным і будзеным жыцці.

Пісьменнікі адзначаюць асаблівасці паводзін і функцыі членаў сям'і, якія залежаць ад формы і тыпу сацыяльнай групы – аўтарытарны выгляд – у вялікіх бацькоўскіх сем'ях, дэмакратычную мадэль – у вялікіх брацкіх і малых сем'ях. Гаспадар-мужчына ў шматлікіх сем'ях з радаводу паэм "Новая зямля", "Яна і я" і аповесці"Камароўская хроніка" выконвае функцыі кіравання сваякамі і блізкімі, прадстаўніцтва і абароны членаў сям'і, размежавання сялянскага надзелу і гаспадарчых абавязкаў, вызначэння складу гаспадаркі, захоўвання і размеркавання сямейных фінансаў, адабрэння тых ці іншых дзеянняў

падпарадкаваных яму асоб. Як правіла, у добрай сям'і аўтары адлюстроўваюць гаспадара як прыклад у паводзінах, чалавека, які вылучаецца рацыяналізмам і разважлівасцю.

Функцыі жанчыны ў традыцыйнай беларускай сям'і залежаць ад яе ўзросту, сямейнага становішча, асабістых якасцей і здольнасцей. У творчасці класікаў беларускай літаратуры адлюстроўваны вобразы разумных, працавітых жанчын. Аўтары не разглядаюць іх як выключна падпарадкаваных і пазбаўленых правоў. Пісьменнікі канстатуюць строгае раздзяленне працы на мужчынскую і жаночую. Аднак, адзначаюць выпадкі, калі для мужчыны выконваць жаночую працу лічыцца недапушчальным, а жанчына, у сваю чаргу, выконвае і мужчынскую і жаночую работу. На думку аўтараў, абавязкі жанчыны з'яўляюцца больш адказнымі і напружанымі, чым у мужчыны. Але у добрай сям'і ў творах пісьменнікаў немалую ролю адыгрываюць ўзаемапавага, узаемадапамога і здольнасць дасягаць кампрамісу. Сярод фактараў, што негатыўна адбіваюцца на сямейных адносінах, яны неаднаразова ўзгадваюць п'янства.

Такім чынам, выхаванне падрастаючага пакалення нельга ўявіць без апоры на важнейшыя традыцыйныя сямейныя каштоўнасці, адлюстраваныя ў паэме Якуба Коласа "Новая зямля", паэме Янкі Купалы "Яна і я", аповесці Максіма Гарэцкага "Камароўская хроніка". Яны заключаюцца ў забеспячэнні і ажыццяўленні рабочага працэсу, нараджэнні дзяцей і выхаванні іх працавітасці і паслухмянасці, павагі да бацькоў і памерлых продкаў. Кожны этап існавання сям'і, статус і функцыі бацькоў і дзяцей, абумоўлены традыцыйным ладам і рытуаламі, якія рэгламентуюць жыццё супольнасці, дапамагаюць захаваць на працягу стагоддзяў і перадаць нашчадкам аксіялагічную канцэпцыю грамадства.

Вывучэнне творчасці класікаў з'яўляецца неабходнай умовай для развіцця і фарміравання асобы. У эпоху духоўнага крызісу, разбурэння традыцыйнай сямейнай мадэлі нельга пакідаць па-за ўвагай выпрацаваныя на працягу стагоддзяў аксіялагічныя нормы. Выхаваўчы працэс заснаваны на фундаментальных каштоўнасцях беларускага грамадства, якія знаходзяць сваю рэалізацыю ў працэсе выкладання дысцыпліны "Беларуская мова (прафесійная лекіска)", а таксама ў шматлікіх пазааўдыторных мерапрыемствах, прысвечаных мастацкай спадчыне беларускіх пісьменнікаў.

**Спіс літаратуры**

1 Беларусы. Том 5: Сям'я / В. К. Бандарчык [і інш.] ; рэдкал.: В. К. Бандарчык [і інш.]; Ін-т мастацтва, этнаграфіі і фальклору НАН Беларусі. – Мінск : Беларуская навука, 2001. – 375 с.

2 **Гарэцкі, М.** Збор твораў : у 4 т. / М. Гарэцкі. – Мінск : Маст. літ., 1984–1986. – Т. 4. Камароўская хроніка : аповесць. Летапіс жыцця і творчасці. – 1986. – 384 с.

3 **Колас, Я.** Новая зямля. Сымон-музыка : паэмы / Я. Колас. – Мінск : Маст. літ., 1986. – 448 с.

4 **Купала, Я.** Поўны збор твораў : У 9 т. Т. 6 : Паэмы, пераклады 1915–1929 / Я. Купала. – Мінск : Маст. літ., 1999. – 430 с.

*A. U. YARMOLENKA*
*Belarusian State University of Transport, Gomel*

**FAMILY EDUCATION ON THE BASIS OF THE TRADITIONAL AXIOLOGICAL MODEL OF CLASSICAL BELARUSIAN LITERATURE**

The article analyzes the role of the system of traditional family values of classical Belarusian literature for the upbringing of the individual. The traditional forms and functions of the family, the role and place of its members in the family hierarchy, the main tasks and methods of upbringing are understood. The dominant influence on the formation and de-velopment of the younger generation of the axiological model of the traditional Belarusian family has been determined.

Получено 01.02.2021

УДК 37.062.1/3

## АДАПТАЦИЯ СТУДЕНТОВ В УСЛОВИЯХ ОБРАЗОВАТЕЛЬНОЙ СРЕДЫ УЧРЕЖДЕНИЯ ВЫСШЕГО ОБРАЗОВАНИЯ

*Т. С. ЯКИМЧИК*
*Белорусский государственный университет транспорта, г. Гомель*

Время обучения в университете дает возможность определить и осознать свои индивидуальные особенности. В процессе адаптации важную роль отводят учебной деятельности. От успеха в адаптации зависят личное развитие, а также рост карьеры будущего специалиста.

Адаптация студентов к обучению в учреждении высшего образования – это системный, двусторонний, поэтапный процесс активного приспособления, обучающегося к условиям образовательной среды, выражающейся в формировании и развитии когнитивных, мотивационно-волевых, социально-коммуникативных связей. Эти связи характеризуют субъектные отношения студента к основным видам его деятельности в образовательной среде учреждения высшего образования.

При этом процесс адаптации носит интерактивный характер: образовательная среда учреждения высшего образования воздействует на студента, а обучающийся активно воздействует на среду, определенным образом преобразуя ее. Выделение связей разного типа помогает глубже понять суть явления, но при этом адаптация протекает системно, как единый процесс. Процесс адаптации имеет временную динамику, его этапы связаны с изменениями, происходящими как в характере учебно-познавательной деятельности, так и на уровне личностных свойств.

Ведущая роль в процессе адаптации отводится учебной деятельности. Формирование общеучебных умений и навыков, развитие логических качеств мышления осуществляется в процессе изучения базовых дисциплин.